*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 20 (451) Панядзелак, 19 чэрвеня 1961 г. Цана 1 кап.

## *Памяці В. Г. Бялінскага*

Грамадскасць універсітэта шырока адзначыла 150-годдзе з дня нараджэння В. Г. Бялінскага. 13 чэрвеня адбылося пасяджэнне навуковых саветаў гуманітарных факультэтаў, прысвечанае вялікаму рускаму крытыку.

У гэтыя дні ў бібліятэках значна павысіўся попыт на творы В. Г. Бялінскага, рэцэнзіі і манаграфіі аб ім. Творчасць чалавека, які «...едва ль не первый заговорил о равенстве, о братстве, о свободе», з'яўляецца тэмай дыпломных і курсавых работ студэнтаў.

## НАШЫ ТАВАРЫШЫ



На чацвёртым курсе матэматычнага факультэта Зенона Наркуна ведаюць не толькі як студэнта-выдатніка, але і як актыўнага грамадскага работніка. Зенон з'яўляецца старастай сваёй групы (тэарэтыкаў), камсоргам курса. Аб тым, што грамадскія даручэнні не перашкаджаюць яму добра вучыцца, ён даказаў у гэтую экзаменацыйную сесію. З. Наркун паспяхова здаў ужо тры прадметы: замежную мову, спецкурс, асновы геаметрыі. Студэнт знаходзіць час не толькі добра вучыцца, але і пачытаць мастацкую кнігу, займацца спортам.

**На здымку:** выдатнік вучобы З. Наркун.

**Фота В. Анцыферава.**

## Завочніца

*НАРЫС*

Каця ўпершыню ўбачыла будаўнічую пляцоўку і ўраз расчаравалася: чаравікі прамоклі, вецер ірваў сукенку.

Хлопцы з брыгады муляроў дружна зарагаталі над яе непаваротлівасцю, і гэты смех зусім збянтэжыў Кацю. Выручыла Люба Посева. Яна спытала ў Каці:

—Да нас?

Не дачакаўшыся адказу, загадала:

—Пайшлі!

Каця чакала ад дзяўчыны звычайных пытанняў-роспытаў. Але Люба расказвала аб сабе.

— А як ты будзеш жыць далей?—спытала яна раптам.

Каця падняла галаву.

—Хачу ўніверсітэт скончыць, філфак. Пакуль планы, а ці здзейсняцца?

—Здзейсняцца! Вось збудуем гэтую школу, сонечную, чыстую. А яшчэ колькі!? Прыйдуць дзеці... Якое шчасце выхоўваць дзяцей мужнымі, смелымі, чэснымі! Ты добрую выбрала спецыяльнасць.

Знізу паклікаў брыгадзір Шульга.

—Вунь, бачыш, заве. Папярэджваю: абавязкова будзе пазычаць грошы. Як стане дамагацца, скажаш мне.

□

Унізе зламаўся пад'ёмнік. Прывезлі цэглу. Працавалі ўручную. Насілі цэглу на другі паверх. Можна было ісці дадому, але брыгада рашыла папрацаваць. Мужчыны селі, закурылі. Брыгадзір з імі. Яны туляцца, відаць, мерзнуць пад калючым ветрам. А з дзяўчат аж пара ідзе. Яны хутка посяць цэглу.

—Хутчэй, хутчэй,—кажа Шульга.

—Сам сядзіш,—злуецца Люба.— Дапамаглі б, абібокі...

Каці цяжка, цяжэй за ўсіх: у яе ні спрыту, ні сілы не стае. Спіна не гнецца. Брызентавыя рукавіцы спаўзаюць,аж гараць рукі.

Вечарам Каця адразу кінулася на ложак, не чакаючы вячэры. Люба раскатурхала:

—Булку з чаем хочаш?

—Не. А вы куды?

—У кіно.

—Што? У кіно?

—Нічога асаблівага, —засмяялася Люба.— Мы загартаваліся. Толькі не кісні: не кожны дзень ломіцца пад'ёмнік.

Каця загарнулася ў коўдру, моцна заснула. Яна прачнулася, калі сяброўкі апраналіся.

Надзя Федарчук засмяялася:

—Ну, як? Вытрымала?

Люба падала ёй гумавыя боты замест чаравікоў.

—Трымай!

Каця ў адказ весела ўсміхнулася.

...І вось мара Каці збылася—яна студэнтка-завочніца ўніверсітэта. Як адзін вялізны дзень прамільгнула зімовая сесія. Яе надыходу Каця баялася. Здавалася ёй, што мала яна рыхтавалася. Яна займалася вечарамі. У цёплым пакойчыку вочы міжволі зліпаліся, і галава хілілася на падушку. Так і заснула б...

«Трэба ж, трэба ж,—загадвала сабе і адрывалася ад падушкі.— Уперадзе экзамены. А экзаменатараў цікавяць больш за ўсё твае веды!»

Дзяўчынкі сумотна казалі:

—Марнуеш ты сябе, Каця.

А дома маці папярэджвала:

—Маладыя гады пройдуць...

Яе сябра Андрэй часта пытаўся:

(Заканчэнне на 2 стар.).

## *У хімікаў ідуць экзамены...*



Пад кіраўніцтвам прафесара Г. Л. Старобінца, загадчыка кафедры аналітычнай хіміі, студэнты 2-га курса хімічнага факультэта на працягу года шмат часу аддавалі заняткам у лабараторыях.

Калі б вы спыталі цяпер у Святланы Слышкінай і Раісы Марцынкевіч, што дапамагае ім зараз добра здаваць экзамены, яны б адказалі: упорная работа ў гаду.

**На здымку:** студэнткі-другакурсніцы С. Слышкіна і Р. Марцынкевіч вызначаюць колькасць салянай і борнай кіслаты ў растворы. **Фота В. Кузьміцкага.**

# СТУДЭНТЫ УНІВЕРСІТЭТА ГОРАЧА АДАБРАЮЦЬ МІРАЛЮБІВУЮ ЗНЕШНЮЮ ПАЛІТЫКУ САВЕЦКАГА УРАДА

☆ ☆ ☆

## Мы з вамі, Мікіта Сяргеевіч!

З вялікім хваляваннем чакалі ўсе савецкія людзі выступлення па радыё і тэлебачанню Мікіты Сяргеевіча Хрушчова. І вось, калі ў эфіры пачуўся голас мужнага змагара за мір М. С. Хрушчова, увесь свет, затаіўшы дыханне, слухаў прамову аб цвёрдым намеры Савецкага ўрада адстаяць мір, не дапусціць развязвання новай сусветнай вайны. Савецкі народ адабрае дзейнасць Мікіты Сяргеевіча ў час сустрэчы яго з прэзідэнтам ЗША Дж. Кенэдзі ў Вене, дзе ішла гутарка аб неабходнасці забараніць выпрабаванні ядзернай зброі, правесці скарачэнне ўзброеных сіл, заключыць мірны дагавор з Германіяй, вырашыць праблему Заходняга Берліна, даць магчымасць лаоскаму народу стварыць мірную і нейтральную краіну.

Усе савецкія людзі ўдзячны Савецкаму ўраду і асабіста Мікіце Сяргеевічу Хрушчову за паслядоўную палітыку , праводзімую ў абарону міру і дружбы паміж народамі ўсіх краін.

В. КАВАЛЬКОЎ.

## *Аднадушна*

Палітыка Савецкага Саюза была і нязменна застаецца міралюбівай. Наша краіна не хоча вайны, яна імкнецца да мірнага суіснавання, да развіцця гандлёвых, культурных і іншых сувязей з краінамі ўсяго свету.

Урады ж заходніх дзяржаў занялі такую пазіцыю, што складваецца ўражанне, што яны не хочуць мірнага ўрэгулявання спрэчных міжнародных праблем.

Мікіта Сяргеевіч у сваім выступленні гаварыў аб тым, што ў сучасны момант склалася такое становішча, калі побач са старым загніваючым капіталістычным ладам існуе міралюбівы прагрэсіўны сацыялістычны лагер.

Ёсць шмат спрэчных пытанняў паміж капіталізмам і сацыялізмам. Але ці значыць гэта, што іх супярэчнасці павінны рашацца пры дапамозе сілы? Не. Мір без зброі—вось чаго патрабуюць народы ўсяго свету.

Мікіта Сяргеевіч прама гаворыць урадам капіталістычных краін: калі вы за мір, то дакажыце гэта справай—падпішыце мірны дагавор... Іншая палітыка не можа не насцярожыць народы

Многія спрэчныя міжнародныя пытанні можна і трэба рашаць шляхам мірных перагавораў, сустрэч кіраўнікоў вялікіх дзяржаў на вышэйшым узроўні і г. д.

Выступленне М. С. Хрушчова было прасякнута ленінскай ідэяй аб мірным суіснаванні двух процілеглых сацыяльных сістэм.

Выкладчыкі і студэнты універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, аднадушна падтрымліваюць выступленне М. С. Хрушчова.

Н. ЯРАВІКОЎ,
загадчык кабінета палітэканоміі.

## Падтрымліваем

Мы ўжо задоўга ведалі, што 15 ліпеня, у 8 гадзін вечара, адбудзецца выступленне па радыё і тэлебачанню Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова, прысвечанае яго нядаўняй сустрэчы ў Вене з прэзідэнтам ЗША Джонам Кенэдзі.

Роўна ў вызначаны час мы амаль усе былі ля рэпрадуктараў і тэлевізараў і з вялікай увагай слухалі прамову тав. Хрушчова. Мікіта Сяргеевіч закрануў у сваім выступленні набалелыя пытанні сучаснасці, выкрыў палітыку заходніх дзяржаў, накіраваную на распальванне новай сусветнай вайны.

Што хвалюе цяпер усе чалавецтва? Што з'яўляецца галоўным у міжнародных адносінах паміж краінамі?

Заключэнне міжнароднага пагаднення аб усеагульным і поўным раззбраенні і забароне выпрабаванняў ядзернай зброі, нармалізацыя становішча ў Берліне і ліквідацыя стану вайны з Германіяй ,мірнае ўрэгуляванне лаоскага пытання—вось вузлавыя кардынальныя праблемы, на якіх спыніўся М. С. Хрушчоў.

Студэнты Белдзяржуніверсітэта поўнасцю падтрымліваюць выступленне главы Савецкага ўрада, бо у гэтым выступленні найбольш ярка выявіліся жаданні народаў усяго свету, іх імкненні да міру і шчасця.

А. КОНЧЫЦ,
студэнт IV курса філалагічнага факультэта.

# Завочніца

*(Працяг).*

НАРЫС

—Ну, як?

—Вучуся! —адказвала Каця і рашуча клала на чысты абрус падручнікі.

Здаралася, сяброўкі, Андрэй насядалі і выцягвалі з пакою.

А ў жыцці брыгады адбыліся змены. Брыгаду ўзначаліў Мікалай Анціповіч, камуніст, дэмабілізаваны воін. Новы брыгадзір добра разумеў справу.

Аднойчы муляра Грышу Новіка засталі за кражай шалёвак. Яго паводзіны абмяркоўвала брыгада:

—Скнара! ...Уласнік!

—Яму няма месца з намі!

—Выгнаць!

Паднялася Каця, спытала:

—Выгнаць? А ён у нашай брыгадзе дванаццаць гадоў працуе! Куды ісці яму? У чалавека, можа, свядомасць... тры класы ўсяго...

Не падтрымаў і новы брыгадзір. А Новік—пераменіўся...

Хутка Кацю вылучылі агітатарам, даверылі ёй выпуск баявых лісткоў. Часта хлопцы рэзаліся ў «казла».

—Цярпення не стае,—скардзілася Каця. Прыходзячы да хлопцаў, яна гаварыла:

—Паслухайце лепш, што «Камсамолка» піша!

—Не перашкаджай,—адмахваліся хлопцы, што ёсць моцы стукаючы аб стол касцяшкамі.

Каця садзілася да дзяўчат. Чытала ім. Неяк падышоў Анціповіч.

—Як зацікавіць тых, астатніх?—кіўнула яму Каця.

—А чым?

—Вучобай. Чаму ў брыгадзе ніхто не вучыцца? Буткевіч. Мартыновіч, Рамančук нават пакінулі вячэрнюю школу. Ды і вы?

Анціповіч апусціў вочы:

—Не, я збіраюся ў будаўнічы тэхнікум. Віктар Сарока разам са мною. Пастой... мяне ж пядаўна Пікулік, Максімовіч і Лойка пыталі пра курсы шафёраў.

—Вось і добра. А з дзяўчатамі я ўжо дамовілася: ва ўніверсітэт культуры пойдуць.

—А Грыша?..

З ім гутарылі ўсе. Новік не згаджаўся, пачынаў кпіць:

—Мне трыццаць год. Смехацце: чытаць байкі, як мядзведзіха купае медзведзянят!

Пераконвалі яго ўсёй брыгадай:

—Ці з намі, ці ...Мы ж змагаемся за званне брыгады камуністычнай працы! Падводзіць таварышаў?

Грыша нехаця буркнуў:

—Згодзен!

Каця паспяхова вучылася і перайшла на чацверты курс філалагічнага факультэта. Брыгада за гэты час пабудавала дзве школы, жыллёвы дом, інжынерны корпус для Мінскага аўтамабільнага завода. Яна заваявала ганаровае званне камуністычнай. У заліковай кніжцы Каці толькі «выдатна» і «добра». Вярхоўны Савет БССР узнагародзіў агітатара Ельяшэвіч Ганаровай граматай.

Цудоўны —неспакойны дзень перажывала Каця 19 сакавіка 1961 года. Яе выбіралі дэпутатам мясцовага Савета! Яе, дваццаці трохгадовую дзяўчыну! «Хіба няма старэйшых і лепшых? Ну, за што мяне?»—думала дзяўчына.

У той дзень да яе падышоў Новік. Ён разгарнуў бюлетэнь:

—Слухай: «Ельяшэвіч Екацярына Іванаўна—кандыдат у дэпутаты...»,—прачытаў ён і ціха дадаў:

—Віншую!

Каця адчула ў грудзях прыліў нястрымнага шчасця.

**Ул. ГУЛЬКО,**
**студэнт 2-га курса адд. журналістыкі.**

## У хімікаў ідуць экзамены...



**На здымку:** студэнтка 2-га курса хімфака А. Бузіна вызначае жорсткасць вады. Дзяўчына на «выдатна» здала замежную мову і цяпер упарта рыхтуецца да іншых экзаменаў.

**Фота В. Кузьміцкага.**

# Сіла дружыны— у сувязі з грамадскасцю

**В. ПРАКОШЫН,**
**член бюро камітэта камсамола**

Два гады назад былі створаны першыя добраахвотныя народныя дружыны. Нядаўна ва ўніверсітэце адбыўся сход дружыннікаў, прысвечаны гэтай даце.

Аб тым, якіх поспехаў дасягнула дружына, як у наш побыт, наша жыццё ўсё больш увахозяць камуністычныя парасткі, камуністычныя адносіны да працы, вучобы, адпачынку расказвалі на сходзе дружыннікі. У дакладзе камандзіра дружыны, у выступленнях камандзіраў атрадаў і звеннаў прыводзілася шмат прыкладаў з жыцця ўніверсітэта, гаварылася аб той вялікай рабоце, якую правяла студэнцкая дружына за два гады існавання. Многія выступаўшыя спыняліся на недахопах і задачах на будучае, якія стаяць перад дружыннікамі.

Вось некаторыя факты і лічбы, якія прыводзілі ў сваіх выступленнях дружыннікі. Ва ўніверсітэце цяпер налічваецца 968 дружыннікаў, з іх 84 членаў КПСС і 865 камсамольцаў. Дзяжурствы праводзяцца штодзённа. У мікрараёне, у Палацы культуры, на дарогах таксама можна ўбачыць нашых студэнтаў. 15 чалавек з універсітэта з'яўляюцца грамадскімі аўтаінспектарамі.

Наша дружына многа зрабіла ў навядзенні парадку ў грамадскіх месцах, на вуліцах і г. д. За два гады дружыннікі універсітэта папярэдзілі шмат парушэнняў парадку. 80 пісьмаў і актаў накіраваны на месцы работы і жыхарства людзей, якія да гэтага часу яшчэ не змылі з сябе пляму мінулага: п'яніц, хуліганаў, дармаедаў, спекулянтаў. 80—не так ужо і многа за два гады. Трэба адзначыць, што злачыннасць у нашай краіне год ад году зніжаецца і, наадварот, няўменна расце камуністычная свядомасць савецкіх грамадзян. Наша дружына робіць усё для таго, каб гэты рост быў яшчэ больш і значным.

Прыемна адзначыць, што дружыны факультэтаў навучыліся па-сапраўднаму змагацца за правядзенне ў жыццё перадавой савецкай маралі, культурных паводзін у грамадскіх месцах. З лепшага боку можна адзначыць хімічны, геаграфічны, матэматычны факультэты. Дружыннікі гэтых факультэтаў рэгулярна выходзяць на дзяжурствы, пры затрымцы парушальнікаў праяўляюць смеласць і знаходлівасць. Сярод узнагароджаных дружыннікаў нямала хімікаў—Болбас, Петрашкевіч, Рунцо, Пілько, Галяшкевіч і інш.

Лепшыя дружыннікі —прыклад для ўсіх студэнтаў. Яны не толькі добра сочаць за грамадскім парадкам, але і добра вучацца. Тым больш здзіўляюць паводзіны некаторых дружыннікаў, якія самі зачастую парушаюць парадак. Такіх адзінкі. Але гэта не значыць, што аб іх мы не павінны гаварыць.

Хочацца сказаць некалькі слоў аб дружынніках філфака. Тут нізкая дысцыпліна, няма пачуцця адказнасці за даручаную справу. Часцей за ўсё зрываюць дзяжурства, спазняюцца ў штаб дружыннікі-філолагі. А бывае і такое. Дружыннікі педінстытута, нашы суседзі, затрымалі п'янага хлопца. У яго таксама быў значок дружынніка. Гэта быў студэнт філфака Астрэйка. Вельмі нядобра атрымліваецца, калі самі камсамольцы-дружыннікі парушаюць парадак.

На філфаку выбран новы камандзір атрада Марозаў, у інтэрнаце створан пост дружыннікаў.

Што яшчэ робяць дружыннікі? Яны чытаюць лекцыі, выпускаюць фотагазеты, вядуць агітацыю сярод насельніцтва.

1 красавіка 1961 года пачаў дзейнічаць новы крымінальны кодэкс БССР. У ім прадугледжаны яшчэ больш формы ўздзеяння грамадскасці на парушальнікаў парадку. Вялікую ролю набываюць таварыскія суды.

Крымінальны кодэкс ставіць перад дружыннікамі новыя задачы, патрабуе новых метадаў работы, заклікае павышаць пільнасць, дысцыпліну, ініцыятыву.

## ДАВЕДКА

# Што дае 3% дзяржаўная пазыка

*Дзяржаўная 3% унутраная выйгрышная пазыка з'яўляецца для насельніцтва зручнай і выгаднай формай захавання зберажэнняў. Па аблігацыях пазыкі выплачваецца даход у выглядзе выйгрышаў, якія разыгрываюцца ў штогодніх 6-ці асноўных тыражах і ў адным дадатковым.*

*У сувязі са змяненнем з 1 студзеня 1961 года маштаба цэн намінальны кошт аблігацый 3% пазыкі пералічан без прастаўлення на іх якіх-небудзь адзнак аб гэтым. Аблігацыі 3% дзяржаўнай пазыкі пасля 1 студзеня 1961 года таксама свабодна прадаюцца і купляюцца ашчаднымі касамі, але ўжо коштам у 10, 20 рублёў і г. д. Выйгрышы, разыграныя да 1 студзеня 1961 года, але не атрыманыя да гэтага тэрміну, выплачваюцца пасля 1 студзеня 1961 года з разліку адной дзесятай часткі.*

*Чарговыя пятнаццаты і шаснаццаты разрады пазыкі былі выпушчаны пасля 1 студзеня 1961 года. Аблігацыі гэтых разрадаў пазык маюць такія ж умовы, як і папярэднія 14 разрадаў і аднолькавую з імі нумарацыю аблігацый. Аблігацыі ўсіх гэтых 16 разрадаў на роўных умовах будуць прадавацца і купляцца ашчаднымі касамі, а затым удзельнічаць у тыражах выйгрышаў.*

*У застаўшыйся час гэтага года тыражы выйгрышаў па 3% дзяржаўнай пазыцы будуць праведзены ў тыя ж тэрміны, што і ў папярэднія гады:*

*30 ліпеня—у горадзе Львове,*

*30 верасня—у горадзе Ленінградзе,*

*30 лістапада—у горадзе Алма-Аце.*

*Таварышы! Удзельнічайце ў 3% дзяржаўнай пазыцы!*

*Вы маеце магчымасць выйграць ад 5, 10 да 5000 і 10000 рублёў.*

**В. КОРХАЎ,**
**галоўны бухгалтар БДУ.**

# З дзецьмі—былыя студэнты

*І вось універсітэцкі гарадок. Перад рабятамі расчыніліся шырокія дзверы біякорпуса, і яны, нават не здымаючы турысцкіх катомак з плячэй, падняліся на другі паверх, зайшлі ў заалагічны музей.*

*Адразу загарэліся вочы дзяцей! Колькі тут цікавага! Чучалы птушак, звяроў, рыб! Не, за гэтым трэба было ісці ў шматдзённы турысцкі паход: з начоўкамі, кастрамі, з пераездамі на чыгунцы! Нездарма зроблена і пройдзена столькі кіламетраў! Тое, што дзеці раней чулі на ўроках, яны ўбачылі сваімі вачыма. Хай сабе нежывыя гэтыя птушкі і пабуны, рыбы і лясныя звяры! Але яны мала чым адрозніваюцца ад жывых. Тыя ж памеры, афарбоўка. Гэта не тое, што ў кнігах.*

*І колькі іх, самых розных жыхароў зямлі! Цяжка нават і пералічыць. Пра ўсё, што вучылі ў школе на ўроках заалогіі і батанікі, а таксама анатоміі, ўбачылі вучні ў багацейшым заалагічным музеі ўніверсітэта.*

*Хто ж прывёў сюды маленькіх экскурсантаў? Як правіла, з дзецьмі прыязджаюць і прыходзяць на экскурсіі ва ўніверсітэт былыя студэнты БДУ, нядаўнія выпускнікі філалагічнага, гістарычнага, геаграфічнага факультэтаў. І ў першую чаргу яны ідуць ва ўніверсітэцкія музеі: заалагічны, геалагічны, гістарычны. Адзіныя ў сваім родзе гэтыя музеі шмат ведаў даюць дзецям, дапамагаюць пазнаць свет ва ўсёй яго шматграннасці і складанасці.*

*Мы сустрэліся з адным з мінулагодніх выпускнікоў філфака Уладзімірам Піскуном.*

*Цяпер Уладзімір — настаўнік, малады педагог, які несе свет навукі ў вёску. Ён працуе ў Падарскай васьмігадовай школе Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Уладзімір расказаў аб сабе:*

*—У школе я выкладаю беларускую мову. З работай асвойся. На жыццё не скарджуся. Цягне, праўда, іншы раз у Мінск. А вучні мае—добрыя, дапытлівыя хлопчыкі і дзяўчынкі. Яны вельмі хацелі пабываць у Мінску. І вось магчымасць прадставілася. Ва ўніверсітэце я пабываю з дзецьмі абавязкова. Ну і, вядома, у іншых выдатных мясцінах Мінска.*

*Мы рассталіся з Уладзімірам. Ён павёў сваіх дзяцей па вуліцам сталіцы. Іх было чалавек 30: вучняў 5—8 класаў. Гледзячы ўслед экскурсантам, я падумаў: добра, калі ў падрастаючага пакалення такія неспакойныя, маладыя настаўнікі. Вось падрастуць школьнікі, паскончаюць школы і многія, напэўна, пажадаюць вучыцца далей. І ясна, што многія пойдуць па слядах свайго настаўніка: пойдуць вучыцца туды, куды цяпер прыходзяць на экскурсіі.*

*А. ВАСІЛЬЕЎ.*

Нам. рэдактара Р. ПЛАТОНАЎ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.

Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР

АТ 06450. Зак. 1427.